Кахновіч, В.А. Судовыя цяжбы з удзелам адміністрацыі маёнткаў князёў Радзівілаў як адлюстраванне сацыяльных і палітычных рэалій пачатку XX ст. на Случчыне / В.А. Кахновіч // Беларусь, Слуцкі край і Эдвард Вайніловіч: мат–лы Міжнар. навук.-практ. канф., г. Слуцк, 22 верасня 2017 г. / Інстытут гісторыі НАН Беларусі; рэдкал.: А.А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск: Медысонт, 2018. — С. 265—284.

**Віктар Кахновіч**

# Судовыя цяжбы з удзелам адміністрацыі маёнткаў князёў Радзівілаў як адлюстраванне сацыяльных і палітычных рэалій пачатку XX ст. на Случчыне

Вядома, што валоданні князя Антона Вільгельма Радзівіла (1833—1904) складалі па стане на 1876 г., паводле афіцыйнага зямельнага ўліку, 172,8 тыс. дзес. у 5 паветах Мінскай губерні. Між тым, са 131 маёнтка, а таксама 5 лясніцтваў (якіх усяго было 5), што лічыліся ў складзе зямельнага валодання князя А. В. Радзівіла ў Мінскай губерні — 120 (або 91,6 %), знаходзіліся ў Слуцкім павеце. Сумарна тое складала 115,12 тыс. дзес. (76,5 % ад усяго землевалодання князя) і 16,13 % ад агульнай плошчы Слуцкага павета (713,8 тыс. дзес.)[1]. З улікам зямель, што па сялянскай рэформе 1861 г. адышло сялянам, а гэта прыкладна 1/3 у сярэднім па маёнтках у Беларусі, ці ў валоданнях Радзівілаў недзе 1/4 падаткаабкладаемых і ўлічаных афіцыйнай статыстыкай плошчаў, то атрымліваецца, што землеўладанне князя А. В. Радзівіла ахоплівала да 25 % усёй плошчы павета. Тое, па сутнасці, рабіла Радзівілаўскую вотчыну найбольш значным фактарам у сацыяльных і эканамічных працэсах Случчыны. Між тым, выяўленыя асаблівасці статыстыкі XIX — пачатку XX ст. сведчаць[2], што мог назірацца істотны недаўлік зямель. Напрыклад, для Давыд-Гарадоцкай ардынацыі на Палессі афіцыйны ўлік засведчыў у 3–4 разы менш зямель, чым тое паказваюць матэрыялы ўнутранага ўліку ардынацыі на канец XIX ст. Такім чынам, зямельныя ўгоддзі А. В. Радзівіла і яго нашчадкаў (сын Юрый у 1904—1914

[1] Список землевладельцев Минской губернии за 1876 год. Минск, 1877. С. 131–134.

[2] Кохнович, В. Хозяйство в имениях на Полесье в 1861—1914 гг. Саарбрукен, 2015. С. 111–112, 296, 308.

гг. і ўнук князь Альбрэхт у 1914—1935 гг.) Слуцкім павеце на пачатак XX ст. маглі мець не 75,9 тыс. дзес., а 120 тыс. дзес. зямлі і больш. Землеўладанне Радзівілаў Несвіжскай і Клецкай ардынацый у Мінскай губерні пасля вылучэння ў 1904 г. Давыд-Гарадоцкай ардынацыі пададена ў табл. 1.

Табліца 1 — Землеўладанне князя Юрыя Радзівіла ў Мінскай губерні паводле крыніцы 1905 г.[3]

| **Назвы маёнткаў (месцазнаходжанне)** | **Даход ад зямель** | **Лясы і даход ад іх** | | **Агульны па маёнтку — даход і плошча зямель** | | **у тым ліку землі I klasy** | | **II klasy** | | **III klasy** | | **IV klasy** | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Okręg Nieswieski (Slucki powiat)** | руб. | руб. | дзес. | руб. | дзес. | руб. | дзес. | руб. | дзес. | руб. | дзес. | руб. | дзес. |
| Zabłocce | 7562 | | | 7562 | | | | 137,04 | 224,5 | | | 137,04 | |
| Mosciewicze | 599,1 | | | 599,1 | | | | 10,04 | 14,89 | | | 10,04 | |
| Malewo | 49792 | | | 49792 | | | 1189,25 | 903,04 | | | | 903,04 | |
| Zarzecze z ucz. w Ogrodnikach i Wojniłowiczach | 35327 | | | 35327 | | | 794,25 | 641,01 | | | | 641,01 | |
| Alba | 13053 | 1567 | | 14620 | | | 390,5 | 237,01 | | 96,47 | | 265,03 | 69 |
| Litwinowka | 1568 | | | 1568 | | | | 28,02 | 42 | | | 28,02 | |
| Suczycha | 380 | | | 380 | | | | 6,04 | 9,09 | | | 6,04 | |
| Sumieńszczyzna | 960 | | | 960 | | | | 17,02 | 29 | | | 17,02 | |
| Kul | 1600 | | | 1600 | | | | 29,00 | 40 | | | 29,00 | |
| Ostrówki I | 1172 | | | 1172 | | | | 21,01 | 42 | | | 21,01 | |
| Sołtanowszczyna | 14286 | | | 14286 | | | | 259,01 | 392 | | | 259,01 | |
| Kaczanowicze I | 10454 | | | 10454 | | | | 189,03 | 304 | | | 189,03 | |
| Kaczanowicze II | 19154 | | | 19154 | | | | 347,03 | 593,5 | | | 347,03 | |
| Dubiejki | 4022 | | | 4022 | | | | 73,00 | 146 | | | 73,00 | |
| Pleszewicze | 20960 | | | 20960 | | | | 380,02 | 557 | | | 380,02 | |
| Radków | 7140 | | | 7140 | | | | 129,03 | 900 | | | 129,03 | |
| Betlejem | 10812 | | | 10812 | | | | 196,01 | 307 | | | 196,01 | |
| Jaźwiny | 4887 | | | 4887 | | | | 88,03 | 148,25 | | | 88,03 | |
| Kalarowszczyzna | 2554 | | | 2554 | | | | 46,02 | 104 | | | 46,02 | |
| Hanusowszczyzna | 28454,2 | | | 28454,2 | | | 729,19 | 516,02 | | | | 516,02 | |

[3] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску (далей — НГАБ). Ф. 694. Воп. 2. Спр. 11120. Арк. 2 адв. — 7.

| | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Dyjampol | 11470 | | | 11470 | | | | 208,01 | 359 | | | 208,01 | |
| Kobyla Głowa | 2812 | | | 2812 | | | | 41,04 | 79 | | | 41,04 | |
| Karolin | 8036 | | | 8036 | | | | 145,04 | 303 | | | 145,04 | |
| Bogumil | 7342 | | | 7342 | | | | 133,01 | 249 | | | 133,01 | |
| Bazandarnia | 2612 | | | 2612 | | | | 47,02 | 109,5 | | | 47,02 | |
| Hreskowszczyzna | 8880 | | | 8880 | | | | 161,01 | 249 | | | 161,01 | |
| Kunosa | 9426 | | | 9426 | | | | 171,01 | 260,5 | | | 171,01 | |
| Kaniszcze | 4360 | | | 4360 | | | | 79,01 | 171 | | | 79,01 | |
| Perekopowszczyzna | 4258 | | | 4258 | | | | 77,01 | 153 | | | 77,01 | |
| Nieswież — zamek i Zajezierze | 6260 | | | 6260 | | | 143 | 113,64 | | | | 113,64 | |
| Antopol | 3450 | | | 3450 | | | | 62,61 | 96 | | | 62,63 | |
| Nieswieskie lesnictwo | 10924 | 150362 | | 161226 | | | | 198,33 | 311 | 2798,49 | | 2926,82 | 7622 |
| Zapole | 2480 | | | 2480 | | | | 46,42 | 62 | | | 45,02 | |
| Lubkowszczyzna | 10596 | | | 10596 | | | | 193,37 | 313 | | | 192,37 | |
| Za wsia Rakowicze (worywa) | 1024 | | | 1084 | | | | 18,58 | | | 63,96 | 18,58 | |
| Zasc. Alyjluino i Rakowicze i u Czornyi Balota | 560 | | | 560 | | | | 10,06 | | | 74,95 | 10,06 | |
| **Падсумаванне ў крыніцы** | 328726 | 151869 | | 48035,29 | | | 3177,17 | 5967,68 | 5868,70 | 2756,96 | 98,96 | 8784,6 | 7691 |
| **Okręg Okinczycki (Miński powiat)** | | | | | | | | | | | | | |
| Stary i Nowy Swierźeń | 97497,5 | 203584 | | 300381 | | | 4225,6 | 2317,37 | | 4832,21 | | 7139,54 | 7802,75 |
| (Ucz.) pry (Glinaje?) | | | | | | | 25 | | | | | 1,51 | |
| (Ucz.) pry Rusakowa | | | | | | | | | | | | 3,83 | |
| **Okręg Radziwiłłmontowski (Słucki powiat)** | | | | | | | | | | | | | |
| Cepra i chut. Bampament | 27677,5 | 2635 | 555,33 | 30312,5 | | | | 502,45 | | 47,83 | 122 | 550,95 | |

| | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Ceperka | 14908 | | 329,01 | 14908 | | | | 270,61 | | | | 270,64 | |
| Hłaskowszczyzna | 8435 | | 190,04 | 8435 | | | | 152,13 | | | | 152,43 | |
| Radziwiłłmonty | 41473 | 2362 | 1085,42 | 43835 | | | | 753,91 | | 42,88 | 104 | 795,79 | |
| Krasny Staw i Ruszczyce | 42671 | 1036 | 899,00 | 43707 | | | | 776,06 | | 18,84 | 57 | 794,9 | |
| Kurlandyja i Przeopowszczyzna | 22791 | | 505,25 | 22791 | | | | 413,75 | | | | 413,75 | |
| Grubowszczyzna i Siewków | 29791 | 6049 | 818,25 | 35820 | | | | 540,47 | | 109,81 | 305 | 650,25 | |
| Archymowieze | 20663 | | 496,00 | 21663 | | | | 375,13 | | | | 375,18 | |
| Mostwiłowicze | 25738 | | | 25738 | | | | 467,34 | 825 | | | 467,34 | |
| Szerepowszczyzna | 17181 | | | 17181 | | | | 311,92 | 510,25 | | | 311,01 | |
| Suchlicze | 24746 | | | 24746 | | | | 449,34 | 699 | | | 449,94 | |
| Rosmowicze i Dziemidowicze | 10904 | 4542 | | 15446 | | | | 197,95 | 303 | 82,02 | | 960,4 | 300 |
| Żylicze | 16502 | 602 | | 17104 | | | | 299,58 | 443 | 10,04 | | 310,57 | 52 |
| Kleck | 15413,7 | | | 15473,7 | | | 306,61 | 266,09 | 306,44 | 266,02 | | 266,09 | |
| Siniawka | 5240,8 | 14678 | | 19929,8 | | | | 95,15 | 174,08 | 936,02 | | 361,61 | 830 |
| Moszuki i chutor Bojan | 7858 | 51580 | | 59438 | | | | 142,63 | | | 412 | 1079,1 | 4501 |
| Słobódka | 12316 | | | 12316 | | | | 221,58 | | | 405,75 | 228,58 | |
| Boryczew | 14316 | | | 14316 | | | | 259,68 | | | 525 | 259,55 | |
| Dołhopoły | 1439 | | | 1439 | | | | 25,12 | | | 67 | 26,13 | |
| Zaraków | 9138 | 4733 | | 13871 | | | | 165,89 | 265 | 85,04 | | 251,82 | 291 |
| Nowosiołki | 10709 | | | 10703 | | | | 194,31 | | | 370 | 194,31 | |
| Las w masie ogólnej | | 30856 | | 30858 | | | | | | 559,03 | | 559,83 | 3581 |
| **Падсумаванне:** | 388289 | 119073 | 5185,72 | 501362 | | | | 6965,58 | 3219,35 | 2151,02 | 2136,4 | 9125,9 | 9556 |
| *Stwołowicze i Borowce* | **Nowogradzki powiat** | | | | | | | | | | | | | |
| | 73502,6 | 17437,8 | | 90910,3 | | | | 1066,38 | 1447,01 | 250,90 | | 1319,4 | 375,04 |
| **Okręg Cimkowicki (Słucki powiat)** | | | | | | | | | | | | | | |
| Siemierzowo | 150 | | 3 | 150 | | | | 2,73 | | | | 2,73 | |

| | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Leszno | 645,44 | | | 645,44 | | | 25 | 11,73 | | | | 11,71 | |
| Sciepury | | | | | | | | | | | | | |
| Cimkowicze | 1466 | | | 1466 | 42 | | | 25,61 | | | | 25,61 | |
| Nowosiołki | 15918 | | | 15918 | 469 | | | 208,95 | | | | 208,95 | |
| Paledzie | 8584 | | 248,25 | 8584 | | | | 155,83 | | | | 155,83 | |
| Wygoda | 18582 | 1595 | | 20125 | 603 | | | 336,44 | | 98,97 | 140,25 | 365,41 | |
| Bestryca | 19590,5 | 1882 | | 21472,5 | 541,25 | | | 355,67 | | 34,15 | 147,5 | 359,83 | |
| Pociejki | 16168,9 | 10355 | | 26525,3 | 418,86 | | | 293,54 | | 188,03 | 131 | 481,57 | |
| Leonów | 7650 | | | 7650 | 223 | | | 138,85 | | | | 138,85 | |
| Pociejki zascianek | 5935 | | | 5935 | 145 | | | 107,75 | | | | 107,75 | |
| Rajówka | 24456 | 6415 | | 30877 | 655 | | | 444 | | 116,45 | 157 | 560,45 | |
| Cimkowicze | 32939 | 1090 | | 34039 | 555 | | | 597,98 | | 19,8 | 45 | 617,75 | |
| Żylikowo | 484 | | | 404 | 13 | | | 8,8 | | | | 8,8 | |
| Dereczyn | 3001,8 | | | 3001,8 | 75,83 | | | 57,78 | | | | 57,73 | |
| Pastwisko z włoscianami wsi Dereczyn | 2030 | | | 2030 | 101 | | | 36,67 | | | | 36,67 | |
| Skepjowo | 4900,74 | 2700 | | 7600,74 | | 189,00 | 215,13 | 88,97 | | 49,01 | | 137,98 | 189 |
| Rudno | 192 | | | 192 | | | 6 | 3,49 | | | | 3,49 | |
| Blewszyce | 1350,5 | | | 1350,5 | 34,17 | | | 24,51 | | | | 24,51 | |
| warszawka | 17844,6 | 48977 | | 64821,6 | | 3725 | 847,71 | 323,97 | | 852,83 | | 1176,8 | 3725 |
| Wołka | 5396 | 794 | | 6190 | | 42 | 302 | 97,96 | | 14,42 | | 112,38 | 42 |
| Woszkary | 563,57 | 833,02 | | 1397,06 | | 79,00 | 33,92 | 10,23 | | 15,18 | | 25,36 | 79 |
| **Падсумаванне:** | 187788 | 72545 | | 260433 | 6003,68 | 4038 | 1479,8 | 3412,5 | | 1318,8 | 1343,8 | 4731,3 | 4038 |
| **Okręg Chominkowski (Słucki powiat)** | | | | | | | | | | | | | |
| Milewskie | 20949 | | | 20949 | 941 | | | 380,31 | 941 | | | 380,31 | |
| Deniskowicze i Marjanowo | 18521 | 107714 | | 125335 | 1721 | 9672 | | 338,06 | | 1955,45 | 1721 | 2393,51 | |
| Czudzin i Ludwikowo | 8510 | 84889 | | 31339 | 634 | 2464 | | 118,18 | | 450,75 | 634 | 568,94 | |

| | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Lasy w masie ogólnej | 3410,8 | 243642 | | 246053 | 91 | | 91 | 61,88 | | 4403,38 | | 4464,21 | 13300,17 |
| **Падсумаванне:** | 49490,8 | 375185 | | 484576 | 3387 | 12136 | 91 | 898,43 | 941 | 6808,54 | 2355 | 7706,97 | 13300,17 |
| **Okreg Hreski (Słucki powiat)** | | | | | | | | | | | | | |
| Hresk | 15396,5 | | | 18326,5 | 950,02 | | | 332,71 | 950,02 | | | | |
| Werebjowo | 1929 | | | 1936 | 67,75 | | | 34,97 | 67,75 | | | | |
| Lasy Hreski | 6549 | 113067 | | 119616 | 401,00 | | | 118,90 | 401,00 | | | 2052,6 | 9451 |
| Lichodzieje | 16233 | | | 16133 | 609,00 | | | 294,70 | 609,00 | | | | |
| Haryna (маёнтак) | 6682,5 | | | 6682,5 | 238,21 | | | 121,30 | 238,21 | | | | |
| Haryna | 12819 | | | 12819 | 542,00 | | | 232,71 | 542,00 | | | | |
| Jekutowicze | 9359 | | | 9359 | 465,00 | | | 169,90 | 465,00 | | | | |
| Zabiszczy | 3495,09 | | | 3495,09 | 160,57 | | | 63,41 | 160,57 | | | | |
| Morozy | 16431 | | | 16431 | 690,00 | | | 298,29 | 690,00 | | | | |
| (Wadymaw?) | 1145 | | | 1145 | 55,00 | | | 30,78 | 55,00 | | | | |
| Zagoyczyn | 3752 | | | 3752 | 178,00 | | | 68,11 | 178,00 | | | | |
| Kuliki | 8405 | 2613 | | 11019 | 346,00 | | | 152,60 | 346,00 | | | 47,43 | 230 |
| **Падсумаванне ў крыніцы** | 105124 | 115680 | | 220870 | 4495,55 | | | 1908,38 | 4495,55 | | | 2100,1 | 9713 |

* Заўвага — Назвы структурных адзінак землеўладання пададзена ў варыянце арыгінала з крыніцы. Паводле падлікаў, агульная плошча па 6 акругах, што налічваюць 97–100 маёнткаў і г.д., складае 97,35 тыс. дзес. зямлі, з якіх 48,1 тыс. дзес. складалі лясы (як правіла, угоддзі IV klasy і пазначаныя ў крыніцы як «лясы»). Такім чынам, лясы складалі 49,4 % землеўладання князя Радзівіла. 5 з 6 наяўных акруг (або да 83,5 тыс. дзес.) ці 85,7 % маёнткаў валодання знаходзіліся ў Слуцкім павеце. Тут жа знаходзіліся 5 з 6 лясніцтваў, за выключэннем Акінчыцкай акругі і лясніцтва (маёнткі Стары і Новы Свержань; 12,05 тыс. дзес., з якіх 65 % або 7,8 тыс. дзес. складалі лясы). Заўважым, што найбольш якасныя сельскагаспадарчыя ўгоддзі засяроджваліся ў Нясвіжскай і Цімкавіцкай акругах, дзе ўгоддзі з зямлёй I–III класаў ахоплівалі 54 % і 47 % ад усяго абшару маёнткаў адпаведна, у той жа час у Хамінкаўскай акрузе лясы — да 80 %, а ў Грэскай і Радзівілмонтаўскай — да 70 % плошчы. Акрамя таго, адзначаны пэўныя няясныя звесткі, што адлюстравана ў даных крыніц.

Як вынікае за табліцы 1, на пачатак XX ст. галоўнае месца ў гаспадарцы князёў Радзівілаў належыла лясам. Тое ж адлюстроўваў штат службаў Радзівілаўскай вотчыны на 1905/1906 г. (гаспадарчы год з 1 ліпеня 1905 г. па 1 ліпеня 1906 г.)[4]. Так, паводле штату вотчынная адміністрацыя маёнткаў яснавяльможных князёў Радзівілаў налічвала 34 чал., у тым ліку 5 аддзелаў Галоўнага Праўлення маёнткаў, сярод якіх быў і Лясны аддзел з 3-х чал., а таксама 6 лясніцтваў (Радзівілмонтаўскае, Грэскае, Хамінкаўскае, Цімкавіцкае, Акінчыцкае, Нясвіжскае) — 6 ляснічых, 2 падляснічых (у Цімкавіцкім і Хамінкаўскім лясніцтвах), 8 памочнікаў ляснічых, 4 рахункавода, 20 аб’ездчыкаў, 160 стражнікаў (ляснікоў), а таксама 1 афіцыяліст па вядзенні сенажацяў (Канстанты Зенкевіч у Хамінкаўскім лясніцтве).

Між тым, яшчэ адзін важна аспект, што варта адзначыць у штаце служачых ардынацый Радзівілаў на 1905 г., — гэта вялікае значэнне Юрыдычнага аддзела Галоўнага Праўлення маёнткаў князя Радзівіла (Wydział Prawny Zarzadu Głównego mąków Jasnie Oswieconego Księcia Ordynata Jerzego Radziwiłła). Ён складаўся з трох асоб: Людвік Мікуць (Ludwik Mikuć; obrónca prawny) — на чале Аддзела, Канстанты Керстноўскі і Казімір Урбановіч (Konstanty Kierstnowski i Kazimierz Urbanowicz; referenty). Людвік Мікуць працаваў у Галоўным Праўленні ў 1897 г. і быў адным з найбольш высокааплачваемых служачых вотчыннай адміністрацыі князёў Радзівілаў (па Нясвіжскай і Клецкай ардынацыях). Паказальна і тое, што апроч асобнага аддзела ў складзе адміністрацыі маёнткаў, у яе штат дадаткова ўваходзілі: юрыдычны паверараны па справах і абаронца правоў князёў у Мінску («obrónca prawny w Mińsku») Ежы Вітвіньскі (Jerzy Witwinski), а таксама паверараны і адвакат у Пецярбургу («adwokat w Peterburgu») Баляслаў Альшамоўскі (Bolesław Olszamowski), а таксама «korespondenci Zarzadu» Юзаф Паўлоўскі і Людвік Шульгановіч (Józef Pawłowski i Ludwik Szulhanowicz) у Мінску і Слуцку адпаведна[5].

Звяртае ўвагу на сябе і тая акалічнасць, што паверараны ў справах і адвакат князёў Радзівілаў у Пецярбургу Б. Альшамоўскі меў адзін з самых высокіх намінальных акладаў сярод служачых адміністрацыі маёнткаў Радзівілаў — ён саступаў па акладзе

---

[4] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 11120. Арк. 1—11 адв.
[5] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 11120. Арк. 1 адв. — 2 адв.

толькі галоўнаўпраўляючаму Міхаілу Свідзе (Michal Swida; głównozarządzający) і начальніку Адміністрацыйнага аддзела Галоўнага Праўлення Вінцэнту Чарапавіцкаму (Wincenty Czerepowicki): 1800 руб. да 4150 руб. і 2100 руб. адпаведна. Пры тым, што сярэдні аклад служачых галоўнай адміністрацыі маёнткаў князёў Радзівілаў складаў на 1905 г. 730 руб. (без уліку галоўнаўпраўляючага), а юрысты на службе ў Радзвілаў мелі ў сярэднім 768,5 руб. То гэта бясспрэчна паказвае тое вялікае значэнне, што надавалася юрыстам, якія абаранялі інтарэсы князёў Радзівілаў у розных судах і інстанцыях Расійскай імперыі.

Абазначым галоўныя праблемы Радзівілаўскіх валоданняў у перыяд пасля 1861 г. і да 1914 (1917) г. Першае, гэта супярэчнасці з чыншавікамі з-за зямельных участкаў. Ёсць меркаванне, што чыншавікі былі вынікам пранікнення на землі ВКЛ у XVI ст. нямецкіх каланістаў, ад якіх была засвоена практыка трымання зямлі свабоднымі людзьмі на правах вечнай арэнды[6]. Між тым, самі землеўласнікі (як князь Альбрэхт Радзівіл) і служачыя адміністрацыі княжацкіх маёнткаў лічылі, што чыншавікі (чыншавая шляхта) — гэта колішнія альбо сяляне, альбо дробная шляхта, якія былі асабіста свабоднымі, але атрымлівалі землі ад князя за выкананне ваеннай службы і іншыя паслугі на карысць князёў[7]. Мяркуецца, што звыш паловы ўсёй чыншавай шляхты Беларусі пражывала на землях Радзівілаў, найперш на Случчыне[8]. Яшчэ ў першай палове XIX ст. праходзілі працэсы ліквідацыі асобных груп сялянства (панцырныя баяры, сяляне-слугі, вольныя людзі і інш.), адбывалася іх зліццё з дзяржаўнымі сялянамі[9]. Сярод апошніх на асаблівае становішча прэтэндавала чыншавая шляхта, катэгорыя засцянковай (аколічнай) шляхты, — што трымала свае надзелы паводле права спадчыннасці ці «вечнай» арэнды[10]. Неабходны элемент у часы, калі Радзівілы мелі ўласнае (або дамовае войска), у тым ліку падчас вайны 1812 г., у новых абставінах яны станавіліся феадальным перажыткам. Ужо ў сакавіку

---

[6] Пойда, Д.И. Крестьянское движение на Правобережной Украине в пореформенный период (1866—1900 гг.). Днепропетровск, 1960. С. 41.

[7] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 621. Арк. 64—64 адв.; Воп. 3. Спр. 804. Арк. 45—46 адв., інш.

[8] Кохнович,В. Хозяйство в имениях на Полесье в 1861—1914 гг. С. 129, 305.

[9] Сосна, У.А. Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Мінск, 2000. С. 100.

[10] Макарэвіч В.С. Дробная шляхта Беларусі ў 30—50-я гг. XIX ст.: склад і эвалюцыя сацыяльна-прававога становішча: дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02. Мінск, 2008. С. 25, 28.

1865 г. князі Радзівілы Вільгельм (1797—1870 гг.; слынны прускі генерал, сенатар, ваенны камендант Брандэнбурга) і князь Багуслаў (1809—1873 гг.; прускі генерал, сенатар, мецэнат-католік) — супольныя ўласнікі Несвіжскай (Беларусь), Алыцкай (Украіна) і Прыгодзіцкай (Польшча) ардынацый — звярталіся ў расійскі Сенат з ініцыятывай зацвердзіць палажэнне, каб чыншавікоў (або паводле іх вызначэння, «вольных людзей»), з якімі не будзе дасягнутае новае пагадненне па арэндзе, высяляць з ферм і надзелаў што размешчаны на землях князёў. Трэба патлумачыць, што па скасаванні ў 1861 г. прыгонных парадкаў, зямля маёнткаў паступала ў рынкавы абарот і вартасць яе, як і арэнды, істотна вырастала. Сапраўды, у тым жа 1865 г. Радзівілы паднялі арэндную плату для 26 засценкаў чыншавай шляхты ў Слуцкім павеце ў 3 разы (з 2005 да 6096 руб.). Аднак, вынікам стала тое, што пры прамым патуранні расійскіх чыноўнікаў (аб чым сведчаць архіўныя дакументы) назіралася павальнае ўхіленне чыншавікоў ад выплат і ігнараванне імі вотчыннай адміністрацыі Радзівілаў, самавольнае карыстанне ўгоддзямі (як зямельнымі надзеламі, так і сервітутамі). Наступны крок, які асвятляюць архіўныя дакументы, — гэта ўсялякія перашкоды і замаруджванне судовых цяжбаў паміж землеўласнікам і чыншавікамі[11]. Ужо па стане на 1876 г. фіксавалася 160 такіх судовых цяжбаў[12], што зацягваліся і не былі ў цэлым выніковымі для Радзвілаў. Так, нядоімкі чыншавікоў Радзівілам па Слуцкім, Мінскім і  Навагрудскім паветах у 1878 г. дасягнулі 60 тыс. руб.[13]., а ў пачатку 1878 г. галоўнаўпраўляючы маёнткамі ў лісце так тлумачыў сітуацыю князю А. В. Радзівілу: «Вотчинные и Ординатские имения князя Антона Радзивиллав Минской губернии состоят по большей части из мелких участков от 15 до 30 десятин, называемых застенками. Издавна на этих участках поселились разного звания люди на правах арендаторов, именующие себя шляхтою (…), недоимка достигла 80000 руб., которые без содействия мирового управления взыскать затруднительно. Мировые суды не принимают к своему разбору подобного рода дела под предлогом, что в общих судебных инстанциях заведены этими съемщиками иски

[11] Кохнович В. Хозяйство в имениях на Полесье в 1861—1914 гг. С. 116—117.
[12] НГАБ. Ф. 694. Воп. 4. Спр. 36-а. Арк. 1—22.
[13] НГАБ. Ф. 694. Воп. 15. Спр. 1. Арк. 1.

о праве владения и что, по сей будто бы причине, впредь до решения сих исков, они не могут входить в разбирательство (…), смею просить Ваше Сиятельство о разъяснении мировым посредникам»[14]. Князь, як бачна, зрабіў немалыя намаганні ў гэтым напрамку, але зрушыць сітуацыю не ўдалося. Так, кн. Антон Вільгельм Радзівіл двойчы (у лістападзе 1889 і ў снежні 1892 г.) скардзіўся міністру ўнутранных спраў Расіі, што яго інтарэс у справе з чыншавікамі дзяржаўнымі ўстановамі ігнаруецца, але адказу так і не атрымаў[15]. Разам з тым, выяўляем значную колькасць зваротаў засцянковай шляхты да Радзівілаў з просьбамі аб атрыманні тымі зямлі ў чыншавае трыманне як за 1850-я гг., так і ў пачатку XX ст. Асаблівасцю, заўважнай з 1890-х гг., было тое, што надзелы даваліся ўжо не на «ўсе часы», а заключалася, як правіла, арэндная дамова на 12 гадоў[16]. Вядома са слоў самаго князя Альбрэхта Радзівіла (люты 1915 г.), што ў сярэднім чыншавікі трымалі надзелы па 14 дзес., за якія выплачвалі ў год не больш за 35 руб. і выкупіць, «з-за нямогласці гаспадаркі», надзелы ва ўласнасць не маглі[17].

Устаноўлена, што ў перыяд апекі над маёнткамі князя Юрыя Радзівіла (1904—1914) Эдуарда Вайніловіча назіралася спроба вырашыць даўнюю праблему з чыншавікамі. Э. А. Вайніловіч быў слуцкім павятовым міравым суддзёй, добра ведаў Радзівілаў і сітуацыю ў павеце, таму быў надзвычай кампетэнтным чалавекам ў сацыяльна-прававых праблемах краю. Між тым, стала зразумелым, што нядоімкі па арэндзе з чыншавікоў у поўнай ступені спагнаць не ўдасца. Так, у 1903 г. 15 засценкаў на Случчыне (Качанавічы I з 21 гаспадаркай, Мыслева з 10 гаспадаркамі, Пахабаўшчызна з 7 гаспадаркамі, таксама Качанавічы II — 33 гаспадаркі, Узнога — 31 гаспадарка, Вялікія Дубейкі — 42 гаспадаркі, Савоні — 61 гаспадарка, Калдзезна — 40 гаспадарак і інш.), ці 390 гаспадарак былі вінаватыя да 10 тыс. руб. нядоімак, пры тым, што сярэдні гадавы памер іх арэндных плацяжоў складаў каля 4 тыс. руб.[18] Характэрна, што па стане на 1904 г. сітуацыя практычна не змянілася[19]. Да прыкладу,

[14] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 393. Арк. 58—58адв.
[15] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 621. Арк. 74адв.—76.
[16] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 361. Арк. 1—30; Спр. 400. Арк. 3—4, інш.
[17] НГАБ. Ф. 694. Воп. 1. Спр. 621. Арк. 64—64адв.
[18] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 1116. Арк. 1адв. — 31.
[19] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 1117. Арк. 1адв. — 34.

як быў вінаваты ў 1903 г. Татур Іван з Пахабаўшчызны 809,51 руб., у тым ліку 772,11 руб. нядоімкі пры «акладзе» ў 37,4 руб., так і застаўся пры той жа нядоімцы ў 1904 г. Таксама іншыя жыхары засценка Пахабаўшчызна: Іосіф Прудзінскі — пры акладзе ў 37,4 руб. меў нядоімку ў 954,5 руб., Сцяпан Чыжык — 37,4 руб. і 381,6 руб. адпаведна, інш.[20] Тое ж датычылась жыхароў засценкаў Качанавічы I (Антон Жук, Іосіф Рагневіч, Дамінік Зеньковіч, Іван Стражко і інш.), Качанавічы II, Мыслева, Савоні, Узнога і інш. Як бачна з дакументаў, вырашэнне супярэчак з чыншавікамі для Радзівілаўскай вотчыннай адміністрацыі заключалася ў прабачэнні асноўнай масы нядоімак і пераходзе фактычных надзелаў зямлі да чыншавікоў па выкупе. На прыкладзе засценкаў Слаўкава, Мыслева, Ракавічы бачна, што землеўласніку даводзілася саступаць таксама і пусташы з тым, каб размежавацца і не плаціць падаткі за чыншавікоў[21].

Высвятляецца, што расійскія ўлады на месцах чынілі шэраг перашкод Радзівілам не толькі ў судах, але і злоўжывалі падаткаабкладаннем. Так, са справаздачы галоўнаўпраўляючага Міхаіла Свіды кн. А. В. Радзівілу ад 28 жніўня 1903 г. высвятляецца, што паліцыя спагнала з Zarządu Głownego Dóbr князя пазямельны збор (35 руб., а з нядоікамі 182,54 руб.) з шэрагу засценкаў Слуцкага павета (Сейлавічы — 176 дзес. і 20,75 руб. пазямельнага падатку, Ракавічы — 18,5 дзес. і 1,66 руб., Слаўкава — 575,26 дзес. і 8,18 руб., Куносы — 1701 дзес. і 4,45 руб.), нягледзячы на тое, што тыя перайшлі па выкупе да чыншавікоў[22]. Прычым сума нядоімкі па падатку з чыншавікоў гэтых засценкаў у 4,2 разы перавышала памер падатку за год, а тое значыла, што да 5 гадоў жыхары згаданых засценкаў карысталіся надзеламі па іх выкупе, але ўхіляліся ад выплаты падаткаў і павіннасцей, што не было магчымым пры патуранні павятовых, а пэўна і губернскіх улад. Боьш таго, з колішняга землеўласніка князя Радзівіла спаганяліся за тыя ж засценкі губернскі земскі збор (усяго з нядоімкамі 962 руб.), збор на прычтавыя будынкі (124,61 руб.), прыватны збор (148,31 руб.). Апроч таго, праз двайны ўлік зямель падатковымі

[20] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 1116. Арк. 1адв.; Спр. 1117. Арк. 1адв.
[21] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 10621. Арк. 91, 93адв.
[22] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 10621. Арк. 1адв., 9—11.

інспектарамі, праз «памылкі» акладнога зводу Слуцкага казначэйства і г.д., — звыш наяўнага было абкладзена падаткамі і павінасцямі 2055,5 дзес. князёў Радзівілаў, што пасля шэрагу праверак прызналі і расійскія чыноўнікі[23]. Паказальна і тое, што пры ўстанаўленні правільнага паддаткаабкладання падчас апекі над маёнткамі Радзівілаў Э. А. Вайніловіча, землеўласніку і яго вотчыннай адміністрацыі давялося мірыцца з захопам часткі ўгоддзяў сялянамі і чыншавікамі. Так, у маёнтках Цэпра і Радзівілмонты жыхары засценка Вашкайты і хутара Чарніца занялі 339,5 дзес., што і паказала вымярэнне 1904 г., калі было налічана ў межах валодання князя 823,5 дзес., тады як падатковая экспплікацыя і план 1903 г. налічылі тут у землеўласніка 1032,28 дзес. І тое — «не считая разных отдельных участков»[24].

Дададзім, што яшчэ з пратаколаў пасяджэнняў Галоўнага Праўлення кн. Антона Радзівіла за 1870-я гг. вынікае: 1) 3/4 распараджэнняў гаспадарчай адміністрацыі датычыліся лясной гаспадаркі, ад якой і залежыў найбольш значны і трывалы даход; 2) даходы, разам з тым, моцна залежылі ад спагнання нядоімак па арэнднай плаце за выкарыстанне пустак пад выганы; але 3) сяляне і засцянковая шляхта ў масавым парадку не жадалі ўносіць плату за карыстанне княжацкімі ўгоддзямі і ўжывалі іх самавольна[25]. Нарастаў ціск сялян на землеўласнасць князёў Радзівілаў: як у 1905—1906 гг., так і з 1915 г. Вопіс 4 фонду 694 (Радзівілы) НГАБ фіксуе звыш 50 судовых працэсаў штогод з сялянамі з-за самавольнай высечкі лесу, пасьбы жывёты і г.д. Прычым прыцягвае ўвагу тая акалічнасць, што судовыя цяжбы з сялянамі па гэтых справах нярэдка зацягваліся на некалькі год. Да прыкладу, з сялянамі вёскі Шэйкі Слуцкага павета з-за самавольнай высечкі дрэва ў Машукоўскай лясной дачы, што цягнулася з 1900 г. па 1906 г.[26], або цэлы шэраг спраў аб узысканні (невыніковым) у 1915—1917 гг. з сялян в. Карцэвічы за самавольную пасьбу жывёлы ў княжацкім урочышчы Загор'е[27]; або тыповы выпадак 1905—1906 гг., калі амаль 2 гады з мінімальнай аддачай вялася цяжба з сялянамі в. Еськавічы да выпас тымі жывёлы ў

[23] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 10621. Арк. 89—90.
[24] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 10621. Арк. 104адв.
[25] НГАБ. Ф. 694. Воп. 3. Сп. 942. Арк. 1—202адв.
[26] НГАБ. Ф. 694. Воп. 4. Спр. 4431. Арк. 1—6.
[27] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 4881, 4882, 4883, 4887, 4888.

Дзяніскавіцкай лясной дачы князя[28]. Сапраўдны выбух сялянскага руху назіраўся з восені 1916 г., калі намі налічана, паводле вопісу ф. 694 НГАБ, было не меньш чым 124 судовыя справы з-за парушэння сялянамі маёмасных правоў землеўласнасці Радзівілаў. У той жа час назіраўся шэраг выпадкаў, калі лясы князёў «атакавалі» расійскія вайскоўцы. Ужо ў 1915 г. сапёрны батальён 10 корпуса самавольна высек для сваіх патрэб дрэва ў значнай (не ўдакладненай) колькасці ў Грыбаўскай лясной дачы, а ў 1916 г. штаб-капітан 2-й арміі Язвінскі прама кіраваў парубкай лесу ў той жа дачы для сваіх патрэб[29]. Паказальна і тое, што за 1916 г. падобных выпадкаў беззаконня налічваецца 53, а ў 1917 г. — 22.

Удакладніць сітуацыю дазваляюць уліковыя дакументы Юрыдычнага аддзела Zarządu Głownego Dóbr за 1903/1904 г. (табліца 2)[30]. З іх вынікае, што наша ранейшая ацэнка масштабаў судовых цяжбаў, заснаваная на аналізе зместу вопісаў фондаў архіву Радзівілаў у НГАБ, заніжаная: не каля 20 спраў па самавольнай высечцы лесу і выпасе жывёлы сялянамі на 1904 г., а 411 (табліца 2), а значыць — у 20 разоў больш. Такім чынам, магло мець месца да 2,5 тыс. выпадкаў у 1916 г. і звыш 1 тыс. у 1905 г. адпаведна. Ускоснае падцвярджэнне знаходзім таму ў справаздачнасці асобных лясніцтваў. Да прыкладу, з мая па ліпень 1917 г. у межах адной толькі Ланьскай воласці адбыліся 24 падобныя інцыдэнты з масавым удзелам мясцовых жыхароў; напрыклад, у маі 1917 г. яны разабралі матэрыялы на лясным двары кн. А. Радзівіла[31]. Іншае, што дазваляюць прасачыць даныя Юрыдычнага аддзела Радзівілаў, гэта па-ранейшаму складаныя цяжбы з чыншавікамі (25 % ад усіх судовых спраў), а па-другое — гэта нізкая эфектыўнасць такіх судовых працэсаў для землеўласніка.

Так, па тых справах з чыншавікамі, дзе ў крыніцы былі пададзены даныя, вернута па судзе Радзвілам было толькі 47 % ад сумы прэтэнзій, у той час як памер выдаткаў на такія працэсы складаў да 77 % ад сумы прэтэнзій. Калі ж разглядаць цяжбы з-за самавольнай парубкі дрэва сялянамі, то вярнуць удалося толькі 14 % ад сумы прэтэнзій, тады як выдаткі (па далёка няпоўных звестках крыніц), увогуле нават

---

[28] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 4615. Арк. 1—2.
[29] НГАБ. Ф. 694. Воп. 4. Спр. 5556. Арк. 1—7; Спр. 5598. Арк. 1—2.
[30] НГАБ. Ф. 694. Воп. 2. Спр. 10613. Арк. 4адв. — 111адв.
[31] НГАБ. Ф. 694. Воп. 3. Спр. 1639. Арк. 2—7.

нельга вызначыць. Ацэнку тут дазваляе зрабіць аналіз асобных катэгорый уліку (табліца 2), а яны ўказваюць не толькі на мізэрную аддачу ад судовых цяжбаў для Радзівілаў, а нават і стратнасць для землеўласнікаў абароны сваіх правоў у расійскіх судах. Так, па Хамінкаўскай акрузе з 93 спраў па парубках лесу 9 было прайграна, 9 скончана па згодзе бакоў, 5 так і не пачата судамі, а 69 (77 %) за вызначэннем крыніцы, «выйграна, але не скончана». Заўважым, што сярод усіх 892 спраў 596 (67 %) знаходзіліся ў тым жа стане... Пэўна так юрысты фіксавалі сваю маральную перавагу над расійскім беззаконнем. Прайграна яўна было толькі 34 (3,8 %) спраў, але агульная выніковасць цяжб было нізкай — «выйграна і скончана» па крыніцы, было 110 спраў ці 12,3 %; яшчэ 48 (5,4 %) скончана дабравольна па згодзе бакоў. Можам пабачыць і тое, што справы аб самавольнай пасьбе жывёлы і высечцы лесу сялянамі знаходзіліся ў цеснай звязцы (вылучанае колерам у табліцы 2), а выканаўчыя ўлады і земскі начальнік (павятовы) фактычна патуралі свавольству сялян.

Калі ж разглядаць справы з чыншавікамі, то ступень патурання чыншавікам і ігнаравання прэтэнзій (і правоў) землеўласніка выглядае яшчэ больш масштабнай. Так, з 8 спраў па чыншавым праве па Грэскай акрузе 5 так і не былі распачатыя ў судах, аб выкупе зямлі чыншавікамі па Акінчыцкай акрузе з 9 не было распачата 7 спраў і г.д. (табліца 2). Агульна складаецца ўражанне, што высокія выдаткі на судовыя цяжбы, якія ў цэлым відаць былі стратныя для Радзівілаў, а таксама яўнае ігнараванне судамі і выканаўчымі ўладамі інтарэсаў землеўласнасці княжацкага роду ў Расіі. У дадзеным выпадку лагічна прымяніць да сітуацыі тое назіранне, што зрабіў у сваіх успамінах Э. А. Вайніловіч датычна характару правядзенне сялянскай рэформы 1861 г.[32] Цікава, што «чырвоны» характар расійскай бюракратыі ва ўспрыняцці сучаснікаў (найперш, прадстаўнікоў заможнай зямельнай арыстакратыі Расіі) адзначаў у сваіх працах і сучасны расійскі даследчык І. А. Хрыстафораў. Фактычна, гаворка ідзе аб ігнараванні правоў і значэння прыватнай уласнасці і гаспадаркі. У свой час у 1912 (1911) г. на з’ездах дэлегатаў Аб’яднанага дваранства аб тым прама гаварылі прадстаўнікі прыбалтыйскага дваранства, якія не разумелі апатычнага і бязвольнага разумення прыватнай уласнасці нават расійскімі

[32] Войнилович, Э. Воспоминания Э. Войнилович. Минск, 2007. С. 36—38.

памешчыкамі ў іх масе[33]. Вынікае, што пэўным чынам расійская супольнасць была падрыхтавана да чорнага перадзелу восені 1917 г. і наступнай бальшавізацыі краіны і грамадства.

[33] Объединенное дворянство. Съезды уполномоченных. В 3 т. Т. 2, кн. 2. Масква, 2001. С. 274, 276—282.

Табліца 2 — Агляд судовых цяжб Нясвіжскай вотчыны кн. Радзівілаў на 1904 г.

| **Катэгорыя судовых працэсаў / характарыстыкі згаданых судовых працэсаў (1903/1904 г.)** | Усяго спраў | у вядзенні выканаўчых улад | павятовы з'езд | павятовая адміністрацыя | земскі начальнік | суд акруговы | губернская адміністрацыйная камісія | Дэпартамент Сената | іншыя ўстановы | справы, не распачатыя ў судах | скончаныя дабравольна | выйграныя і скончаныя | выйграныя і не скончаныя | Сума прэтэнзій, руб. | Вернута па судзе, руб. | Дзяржаўных рат на працэс, руб. | з іх вернута, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Нясвіжская акруга (Okręg Nieswieźski)** | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| Аб спагнанні чыншу с засценкаў | **29** | 29 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 4 | 25 | 4200,95 | 672,49 | 4104,62 | 127 |
| Аб нявыплатах за арэнду зямлі засценкамі (за 6 мес. да тэрміну) | **6** | 4 | 1 | | | 1 | | | | | | 1 | 2 | ? | 10 | ? | ? |
| Аб прэтэнзіях розных асоб (аб чыншавым праве) | **8** | | 1 | 3 | | 1 | 3 | | | 8? | ? | ? | ? | ? | ? | ? | ? |
| Розныя справы (з сялян в. Пахабаўшчызна з-за дарог) | **1** | | | | | | | 1 | | 1 | | | | ? | 0? | 27 | 0? |
| Аб размежаванні зямель з сялянамі і засценкамі | **4** | | 1 | 3 | 1 | | 1 | | | 6 | | | | ? | 0 | ? | 0 |
| Аб выкупе зямлі засценкамі чыншавікоў (Ракавічы і інш.) | **14** | | | 5 | | | 5 | 4 | | 8 | | 1 | 5 | ? | ? | ? | ? |
| Аб пратэрміноўцы выплат чыншу | **16** | 16 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 16 | 3666,26 | 1004,24 | 2103 | 205 |
| Аб самавольных парубках лесу | **79** | 31 | 5 | 0 | 40 | 3 | 0 | 0 | 0 | 6 | 9 | 4 | 54 | 731,6 | 43,7 | ? | ? |
| Аб самавольнай пасьбе | **3** | 1 | 2 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 2 | 1 | 9,6 | 6 | ? | ? |
| Аб выкупе зямлі ў засценках | **14** | 0 | 0 | 5 | 0 | 0 | 5 | 4 | 0 | 0 | 0 | 0 | 14 | ? | ? | ? | ? |
| **Радзівілмонтаўская акруга (Okręg Radziwiłłmotowski)** | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| Аб чыншу з мястэчак | **22** | 21 | | | | | | | 1 | | | 7 | 15 | 345,3 | 288,25 | 374,18 | ? |
| Узысканне дзяржаўных рат і г.д. | **5** | | | | | 5? | | | | | | | 4 | 1352,7 | 490,40 | 955,2 | ? |

| | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Аб самавольных парубках лесу | **84** | 62 | 7 | | 15 | | | | | 5 | 1 | 10 | 65 | 1051,11 | 90 | ? | 90? |
| Аб самавольнай пасьбе | **37** | 19 | 5 | | 13 | | | | | 6 | 1 | 2 | 26 | 425,95 | 24 | ? | 24? |
| Аб лясных пажарах | **3** | 1 | 1 | | 1 | | | | | 1 | | 1 | 1 | 700 | 0 | ? | 0? |
| Аб парушэнні дамоў арэнды па зыходу 6 мес. | **16** | 7 | 3 | | 5 | 1 | | | | 5 | 1 | 8 | 2 | ? | 8,5 | ? | ? |
| Аб выкупе зямлі сялянамі | **2** | | 1 | | | | 1 | | | 2 | | | | ? | 0 | ? | 0 |
| **Акінчыцкая акруга (Okręg Okinczycki)** | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| Аб спагнанні чыншу с засценкаў | **45** | 21 | | | 23 | 1 | | | | 1 | 3 | 8 | 34 | 4391,57 | 320,77 | 948,46 | ? |
| Аб самавольнай пасьбе | **2** | 2 | | | | | | | | | | | 2 | 400,77 | 5,00 | ? | ? |
| Аб самавольных парубках лесу | **5** | 5 | | | | | | | | | | 1 | 4 | ? | 24,76 | 58,9 | ? |
| Аб нявыплатах за арэнду зямлі (за 6 мес. да канца дамоў) | **5** | 5 | | | | | | | | | | | 5 | 82,4 | 27 | 88,4 | ? |
| Аб выкупе зямлі чыншавікамі | **9** | | | 4 | | | 1 | 4 | | 7 | | | 2 | ? | 0? | ? | 0? |
| Аб невыкананні дамовы аб арэндзе карчмы ў Заракаве | **1** | | 1 | | | | | | | | | | | ? | 0? | ? | 0? |
| Аб прэтэнзіях розных асоб (аб чыншавым праве) | **23** | | | 9 | 3 | 3 | 5 | 3 | | 6 | 0 | 6 | 9 | 461,5? | 151,2? | 495,5? | ? |
| Розныя справы | **6** | | 1 | | 4 | 1 | | | | 1 | | 1 | 4 | 20,2 | 4,2 | ? | 4,2? |
| **Цімкавіцкая акруга (Okręg Cimkowicki)** | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| Аб чыншы з мястэчак | **2** | 2 | | | | | | | | | | 1 | 1 | 3,68 | 2,34 | 3,68 | 2 |
| Спагнанне дзяржаўных рат і г.д. | **22** | 14 | 1 | | 7 | | | | | 1 | 7 | 2 | 12 | 3427,97 | 413,40 | 1990,02 | 82,34 |
| Аб спагнанні чыншу с засценкаў | **49** | 40 | | | 9 | | | | | | | 5 | 49 | 10418 | 8742,04 | 10299,2 | 292 |
| Аб парушэнні ўмоў кантрактаў | **1** | | | | 1 | | | | | | 1 | | | 200 | ? | ? | ? |
| Аб самавольных парубках лесу | **24** | 5 | 2 | | 17 | | | | | 5 | 2 | 1 | 15 | 345,1 | 18,26 | ? | ? |
| Аб самавольнай пасьбе | **2** | 2 | | | | | | | | | | 2 | | 28,4 | 17,12 | ? | ? |
| Аб адабранні зямлі па дамовах да 6 мес. тэрміну | **5** | 3 | | | 2 | | | | | | | 4 | 1 | ? | 10 | ? | ? |
| Аб прэтэнзіях розных асоб (аб чыншавым праве!) | **12** | | | 8 | 2 | | 1 | 1 | | 2 | | 3 | 7 | ? | ? | ? | ? |
| Розныя справы | **6** | | 4 | | 1 | | 1 | | | 1 | | 1 | 2 | 36,5 | ? | ? | ? |

| | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Аб выкупе зямлі і размежаванні з сялянамі | **3** | 2 | | | | | 1 | | | 2 | | | | ? | ? | ? | ? |
| Аб выкупе зямлі засценкамі чыншавікоў Сцепуры, інш.) | **4** | | | 2 | | | 2 | | | 4 | | | | ? | ? | ? | ? |
| **Хамінкоўская акруга (Okręg Chominkowski)** | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| Спагнанне дзяржаўных рат і г.д. | **47** | 40 | 1 | | 6 | | | | | | 1 | 17 | 29 | 12730,3 | 8549,83 | 1247,7 | 354,5 |
| Аб самавольных парубках лесу | **93** | 44 | 2 | | 46 | 1 | | | | 5 | 9 | 1 | 69 | 1854,14 | 374,61 | 86,58? | 86,58 |
| Аб самавольнай пасьбе | **80** | 32 | 2 | | 46 | | | | | 5 | 10 | 2 | 69 | ? | 1163,21 | ? | 53,53 |
| Аб самавольным паляванні, рыбалоўстве, крыўдах леснікам | **33** | 12 | 4 | | 17 | | | | | 3 | 2 | 1 | 22 | 519,3 | 0? | ? | ? |
| Аб адабранні зямлі па дамовах да 6 мес. тэрміну | **23** | 15 | | | 7 | | 1 | | | 1 | 0 | 7 | 13 | 845 | 707,91 | 832,25 | 55 |
| Аб прэтэнзіях розных асоб (аб чыншавым праве) | **3** | | | 3 | | | | | | 1 | | | 2 | ? | ? | ? | ? |
| Розныя справы | **10** | | | | 10 | | | | | 0 | 1 | 4 | 5 | 28,6 | 7,97 | 86,25 | 26,38 |
| Аб выкупе зямлі і размежаванні з сялянамі | **7** | | | 3 | 1 | | 2 | 1 | | 3 | 0 | 2 | 2 | ? | ? | ? | ? |
| **Грэская акруга (Okręg Hreski)** | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| Аб парушэнні ўмоў кантрактаў | **1** | 1 | | | | | | | | | | | 1 | 6,94? | 6,94 | 5? | 5 |
| Аб самавольных парубках лесу | **2** | 1 | | | 1 | | | | | 1 | | | 1 | 16,8 | ? | ? | ? |
| Аб адабранні зямлі па дамовах да 6 мес. тэрміну | **2** | | 1 | | | 1 | | | | 1 | | | 1 | 23 | ? | ? | ? |
| Аб прэтэнзіях розных асоб (аб чыншавым праве) | **8** | | | 1 | 3 | 2 | 2 | | | 5 | | 1 | 2 | ? | ? | ? | ? |
| Розныя справы | **2** | | | | 2 | | | | | 2 | | | | ? | ? | ? | ? |
| Аб выкупе зямлі і размежаванні з сялянамі | **1** | | | 1 | | | | | | 1 | | | | ? | ? | ? | ? |
| **Давыд-Гарадоцкая ардынацыя (Ordynacya Dawidgródecka)** | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| Аб адабранні зямлі па дамовах па 6 мес. тэрміну | **4** | | | | | 1 | 1 | 2 | | 3 | | | 1 | 4000 | ? | ? | ? |
| Аб прэтэнзіях розных асоб (аб чыншавым праве) | **1** | | | | | 1 | | | | 1 | | | | ? | ? | ? | ? |

| | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Аб чыншу з мястэчак | **2** | | | | | 1 | 1 | | | 2 | | | | ? | ? | ? | ? |
| Розныя справы па іншым акругам | **2** | | | | | 2 | | | | | | | 2 | ? | ? | ? | ? |
| Справы па прапінацыі іншых акругаў | **2** | | | | | | | 2 | | 2? | | | | ? | ? | ? | ? |
| **Усяго:** | **892** | **437** | **46** | **47** | **283** | **20** | **33** | **2<br>2** | **1** | **104** | **48** | **110** | **596** | **51855,2** | **23032,9** | **23118,9** | **1289,3** |
| Аб чыншы з мястэчак | 26 | 23 | 0 | 0 | 0 | 1 | 1 | 0 | 1 | 2 | 0 | 8 | 16 | 348,98 | 290,59 | 377,86 | 2 |
| Аб самавольных парубках лесу | 287 | 148 | 16 | 0 | 119 | 4 | 0 | 0 | 0 | 22 | 21 | 17 | 208 | 3998,75 | 551,33 | 58,9 | 86,58 |
| Аб самавольнай пасьбе | 124 | 56 | 9 | 0 | 59 | 0 | 0 | 0 | 0 | 11 | 11 | 8 | 98 | 864,72 | 1215,33 | ? | 53,53 |
| Аб выкупе зямлі і размежаванні з сялянамі | 15 | 2 | 1 | 7 | 2 | 0 | 4 | 1 | 0 | 12 | 0 | 2 | 2 | ? | ? | ? | ? |
| Цяжбы з чыншавікамі з-за зямлі, арэндных дамоў і г.д. | 227 | 110 | 2 | 35 | 40 | 9 | 19 | 1<br>2 | 0 | 35 | 3 | 29 | 153 | 22676,7 | 10749,5 | 17455,3 | 624 |
| Аб парушэнні розных дамоў (не чыншавікі) | 58 | 31 | 5 | 0 | 15 | 3 | 2 | 2 | 0 | 10 | 2 | 19 | 24 | 5150,4 | 760,35 | 920,65 | 60 |
| Аб самавольным паляванні, рыбалоўстве, крыўдах леснікам | 33 | 12 | 4 | 0 | 17 | 0 | 0 | 0 | 0 | 3 | 2 | 1 | 22 | 519,3 | 0 | 0 | 0 |
| Узысканне дзяржаўных рат і г.д. | 74 | 54 | 2 | 0 | 13 | 0 | 0 | 0 | 0 | 1 | 8 | 19 | 45 | 17511 | 9453,63 | 4192,92 | 436,84 |
| Іншыя справы | 32 | 1 | 6 | 0 | 18 | 3 | 1 | 3 | 0 | 6 | 1 | 7 | 14 | 785,3 | 12,17 | 113,25 | 26,38 |